**І. В. Максімава,**
настаўніца беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
гімназіі № 3 г. Магілёва

## Вучэбнае даследаванне на ўроках беларускай мовы і літаратуры

## Фарміраванне ключавых кампетэнцый вучняў

**У сучасным адукацыйным працэсе існуе шмат тэхналогій, метадаў і прыёмаў, якія прызваны зрабіць працэс навучання і выхавання больш эфектыўным і прадуктыўным. Таму важна ў педагагічнай дзейнасці выпрацаваць такую сістэму навучання, якая будзе ўлічваць індывідуальныя асаблівасці вучняў і адпавядаць запатрабаванням грамадства. Для гэтага неабходна зрабіць школьнікаў актыўнымі саўдзельнікамі адукацыйнага працэсу, развіваць іх творчы патэнцыял. На ўроку неабходна ствараць ўмовы для праяўлення і задавальнення пазнаваўчых і камунікатыўных патрэб вучняў, фарміравання іх ключавых кампетэнцый, абапіраючыся на тэхналогію вучэбнага даследавання.**

Даследчая дзейнасць вучняў на ўроку ўключае дыягнастычны, матывацыйна-мэтавы, тэарэтычны і праектна-творчы напрамкі.

Пры арганізацыі даследчай працы на ўроку трэба ўлічваць узрост навучэнцаў. У 5–7 класах вучні набываюць прасцейшыя веды, уменні і навыкі, якія неабходны для выканання даследчай работы. Ідзе працэс навучання асновам самастойнай дзейнасці, развіцця нестандартнага (крытычнага) мыслення. Так, на ўроку беларускай мовы ў 5 класе пры вывучэнні тэмы «Апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя сказы» выкарыстоўваю наступныя заданні.

<u>Заданне 1.</u> *Пастаўце да сказаў пытанні так, каб выдзеленыя словы былі адказамі.*

***У Алжыры*** знаходзіцца цікавае возера. ***Яго вадой*** можна пісаць на паперы, нібы чарнілам. У возера ўпадаюць ***дзве рэчкі***. Яны багатыя ***на солі жалеза***.

Адказы:

***Дзе*** знаходзіцца цікавае возера? ***Чым*** можна пісаць на паперы? ***Колькі рэчак*** ўпадае ў возера? ***На што*** яны багатыя?

Заданне 2. *Выпішыце з тэксту Эдзі Агняцвет па 2 сказы (апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя) і прачытайце іх з патрэбнай інтанацыяй.*

Вы любіце парк імя Горкага?
Прыходзьце сюды пагуляць.
Тут сосны стаяць на пагорку –
Аб нечым шумяць і шумяць.
Паснезе ў кашулях агністых
Гуляюць зімой снегіры.
А ў маі ў голлі цяністым
Працуюць майстры-штукары.
Прыходзьце паслухаць уранку
Дразда-спевака, берасцянку!
У парку знаходжу я дзівы,
Да ночы гуляць тут гатоў.
А бацька мой ходзіць маўклівы.
Чыіх ён шукае слядоў?

У гэтым годзе на ўроках беларускай мовы пяцікласнікам прапанавала правесці даследаванне слова *Радзіма*. Для гэтага пачалі вывучаць раздзел мовазнаўства, вызначылі сінтаксічную функцыю слова ў сказе, склалі з гэтым словам сінквейны, падабралі прыказкі, вершы беларускіх аўтараў на тэму «Радзіма». Пры правядзенні марфемнага аналізу слова ўдасканалілі навыкі работы з марфемным слоўнікам. Далей наша даследаванне будзе накіравана на характарыстыку слова «Радзіма» як часціны мовы, на гукавы аналіз слова. Такая праца развівае сістэмнае мысленне і творчае ўяўленне вучняў, актывізуе і папаўняе іх моўны запас, выхоўвае пазнавальную цікавасць.

У 8–9 класах значную ўвагу надаю выкананню самастойных заданняў творчага характару, паглыбляю веды школьнікаў па методыцы даследавання і апрацоўцы вынікаў. Напрыклад, на ўроку беларускай мовы ў 9 класе пры вывучэнні складаназлучаных сказаў прапаноўваю вучням наступныя заданні.

- Складзіце схему сказаў. Замяніце іх складаназалежнымі з даданай часткай, якая адказвае на пытанні: чаму? Па якой прычыне?
- Параўнайце сказы. Што паміж імі агульнага і чым яны адрозніваюцца?

У 10–11 класах адбываецца далейшае развіццё ў вучняў даследчых уменняў, удасканаленне творчых падыходаў да рашэння канкрэтных задач, уменняў самастойна рэалізоўваць атрыманыя веды на практыцы. На дадзеным этапе навучэнцы ўжо могуць самастойна выбіраць тэму даследавання, выказваць гіпотэзы, рабіць вывады, рыхтаваць даклады, рэфераты і г.д.

Важна пры арганізацыі даследчай работы ажыццяўляць узаемасувязь у вывучэнні беларускай мовы і літаратуры. Гэтаму садзейнічае работа з тэкстам. Атрымаўшы тэкст і заданні да яго, вучань вызначае тэму, ідэю, аналізуе яго структуру, лексіку, тыповыя сінтаксічныя канструкцыі, асаблівасці аўтарскай мовы і г.д.

Выконваючы комплексны аналіз літаратуразнаўчага тэксту, вучні паўтараюць і ўспамінаюць звесткі з розных раздзелаў мовазнаўства. Тым самым школьнік вучыцца «назіраць за жыццём» слова ў лексічным кантэксце. Навучыўшыся асэнсавана чытаць мастацкі тэкст і каменціраваць аўтарскія прыёмы, школьнік развівае і свае ўменні стварэння звязных тэкстаў.

Пры арганізацыі работы з вучнямі 5–8 класаў выкарыстоўваю такія метады даследчай дзейнасці, якія забяспечваюць засваенне тэксту з улікам жанравых і стылявых асаблівасцей твораў, стымулююць творчую фантазію, моўную дзейнасць. У 9–11 класах аддаю перавагу літаратуразнаўчым падыходам, якія дазваляюць асэнсоўваюць літаратурны твор у адзінстве зместу і формы. Гэтаму садзейнічаюць прыёмы вывучэння гісторыі тэксту, выяўлення аўтарскай пазіцыі, даследавання кампазіцыі, сістэмы вобразаў, дэталей, асаблівасцей мовы і г.д.

Важным для дзяцей-даследчыкаў у пазакласнай дзейнасці аказваецца ўменне працаваць з інфармацыяй, здабываць неабходны навуковы матэрыял, уменне правільна сістэматызаваць яго. Але гэта часта бывае для вучняў складана. Таму на ўроках вызначаю час для таго, каб расказаць, як правільна карыстацца зместам, бібліяграфіяй; вучу дзяцей самастойна складаць простыя і складаныя планы, схемы, табліцы, рэгулярна звяртацца да даведнікаў ці іншых крыніц інфармацыі пры праверцы выкананай працы, самастойна выбіраць і

чытаць літаратуру, перыёдыку. Ствараю ўмовы для развіцця ўмення вызначаць мэту, задачы, аб’екты і прадметы даследаванняў. Спачатку вучні (8–9 клас) аналізуюць і пры неабходнасці карэкціруюць прапанаваныя мэты, задачы, аб’екты, а ў 10–11 класах могуць ужо самастойна сфармуляваць тэму даследавання, вызначыць мэту, задачы, аб’ект і прадмет даследавання. Напрыклад, адзінаццацікласнікам на факультатыўных занятках па беларускай мове і літаратуры пры вывучэнні тэмы «Беларускія тапанімія» *было прапанавана ўзгадаць, што вядома ім пра паходжанне назвы пасёлка* Грабянёва*, дзе размешчана школа, і назвы* Святое *возера, якое знаходзіцца недалёка ад школы.*

*(Вучні працавалі ў групах.)*

✓ Грабянёва: назва паходзіць ад слова *грэбень (гары).* Раней каля гэтага пасёлка знаходзілася вёска, якая размяшчалася на ўзгорку.

– Сваю версію вучні параўналі з версіяй вучаніцы нашай школы А. Лапінай, якая склала вершаваную паэму пра паходжанне назвы Грабянёва.

Людзі баюць, што многа стагоддзяў назад
Была рэчка на месцы тым дзіўным.
Вольны час свой правесці там кожны быў рад,
Рыбакі безліч рыбы лавілі. […]

Як жывая вада падымалася ўгору,
Забурліла так гучна і шпарка.
І з ракі, быццам з шумнага пеннага мора,
Павыходзілі дзевы-русалкі. […]

Промень радасці ў гэту мясціну пранік,
Таму сведкі – іскрыстыя хвалі.
А пасёлак, што быццам на грэбні ўзнік,
Жыхары Грабянёвам назвалі.

✓ Цікавая і этымалогія гідроніма Святое возера. Існуе легенда, што калісьці на месцы возера стаяла царква, якая пазней апынулася пад вадой. Царква –

святое месца, таму і возера, на дне якога знаходзіцца святы будынак, таксама назвалі Святым.

Выкарыстоўваю ў 10–11 класах метад праектаў, бо ён дае магчымасць развіваць такія якасці асобы, як адкрытасць, нестандартнасць мыслення, уменне рэагаваць на зменлівыя ўмовы знешняга свету, вырашаць разнастайныя праблемы, цесна і прадуктыўна супрацоўнічаць з іншымі людзьмі, імкненне да самапазнання, самаўдасканалення і самарэалізацыі. Найбольш эфектыўны гэты метад пры правядзенні факультатыўных заняткаў.

У час падрыхтоўкі праекта вучні карыстаюцца інтэрнэтам, дадатковай літаратурай, табліцамі, працуюць у бібліятэцы з картатэкай, што вельмі важна для развіцця самастойнай працы. Павялічваецца вучэбная матывацыя, таму што яны бачаць бліжэйшае прымяненне засвоенага на ўроку матэрыялу. Метад праектавання рыхтуе навучэнцаў да жыцця, фарміруе навыкі аналізу, сінтэзу, ацэнкі, зносін і супрацоўніцтва. Прадстаўляючы свой праект, рабяты вучацца ясна і лагічна выкладаць свае думкі і выступаць перад вялікай аўдыторыяй.

Кожны настаўнік, які хоча дасягнуць высокіх паказчыкаў пры выкладанні свайго прадмета, заўсёды знаходзіцца ў творчым пошуку, менавіта творчы падыход з’яўляецца асновай педагагічнага майстэрства.

Практыка паказвае, што выкарыстанне элементаў праблемных, пошукавых, даследчых, эўрыстычных метадаў навучання робіць працэс пазнання больш прадуктыўным, дапамагае матываваць гімназістаў на дасягненне найбольш высокіх вынікаў, служыць сродкам для развіцця іх інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай культуры.

## Літаратура

1. **Гузеев, В. В.** Исследовательская работа школьников: суть, типы и методы / В. В. Гузеев // Школьные технологии. – 2010. – № 5. – С. 49 – 52.

2. **Левитес, Д. Г.** Практика обучения: современные образовательные технологии / Д. Г. Левитес. – Воронеж: МОДЭК; М.: Институт практической психологии, 1998. – 288 с.

3. **Методыка выкладання беларускай мовы**: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей установ, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М. Г. Яленскі [і інш.]; пад. рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2007. – 448 с.